ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (752) ● Пятніца, 27 чэрвеня 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII

Набліжаецца знамянальная падзея ў жыцці беларускага і ўсяго савецкага народа — 25-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Святочныя ўрачыстасці, прысвечаныя гэтай даце, пройдуць ва ўсіх гарадах і пасёлках рэспублікі. На прадпрыемствах, у вышэйшых навучальных установах, у клубах і палацах культуры адбудуцца сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, тэматычныя вечары, канферэнцыі, кінафестывалі.

Сённяшні нумар газеты мы прысвячаем жывым і загінуўшым героям, удзельнікам вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

# ПОДЗВІГУ — ЧВЭРЦЬ ВЕКУ

Дваццаць пяць гадоў назад на палях Беларусі разгарнулася адна з буйнейшых аперацый Вялікай Айчыннай вайны і ўсёй другой сусветнай вайны — Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя, якая насіла ў плануючых дакументах ваеннага часу ўмоўную назву «Баграціён». Па глыбіні і ёмістасці стратэгічнай задумы, па маштабу, дакладнасці падрыхтоўкі, майстэрству і тэмпах выканання баявых задач, па ваенна-палітычнай значнасці вынікаў у справе набліжэння пераможнага заканчэння Вялікай Айчыннай вайны яна з'яўляецца адной з найбольш павучальных.

Да ўдзелу ў гэтай вялізнай і арыгінальнай па задуме аперацыі былі прыцягнуты войскі чатырох франтоў — 1-га Прыбалтыйскага, 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх, авіяцыя Далёкага дзеяння, Дняпроўская ваенная флатылія, войскі супрацьпаветранай абароны краіны і шматлікая армія беларускіх партызан. Аперацыя разгарнулася на тысячакіламетровым фронце ад Заходняй Дзвіны да Прыпяці і на глыбіню ў шэсцьсот кіламетраў ад Дняпра да Віслы і Нарэва. З абодвух бакоў у бітву, якая прадаўжалася больш двух месяцаў, была ўцягнута вялікая колькасць войск і разнастайнай тэхнікі. У жорсткіх баях за вызваленне беларускай зямлі загінулі смерцю храбрых многія савецкія воіны і партызаны, памяць аб якіх назаўсёды захаваецца ў сэрцы народа.

Беларуская аперацыя закончылася выдатнай перамогай Савецкай Арміі, якая мела вялікае значэнне. У ходзе бітваў аказалася разгромленай буйнейшая стратэгічная групіроўка ворага — «Цэнтр». Са 110 дывізій і брыгад праціўніка, якія прымалі ўдзел у гэтых баях, амаль 70 злучэнняў былі разгромлены, у тым ліку каля 20 знішчаны поўнасцю. Страты ворага склалі больш чвэрці ўсіх яго сіл, што знаходзіліся на Усходнім фронце да пачатку летне-асенняй кампаніі 1944 года; гэта было катастрафічнае паражэнне гітлераўскага вермахта.

Бітва ў Беларусі з'явілася прыкметным укладам у скарбніцу савецкага ваеннага майстэрства, яскравым сведчаннем высокіх маральных якасцей савецкіх воінаў, вынікам вялікай арганізатарскай дзейнасці Камуністычнай партыі, якая ўзначаліла барацьбу нашага народа з фашызмам.

Знамянальнай датай у развіцці беларускай аперацыі з'явілася 3 ліпеня 1944 года. У гэты дзень войскі 3-га і 1-га Беларускага франтоў вызвалілі ад ворага сталіцу БССР — Мінск, а на ўсход ад яе аказалася акружанай буйная варожая групіроўка агульнай колькасцю больш 100.000 салдат і афіцэраў. Да 11 ліпеня гэта групіроўка праціўніка была поўнасцю ліквідавана. У сярэдзіне ліпеня нашы войскі ўшчыльную падышлі да дзяржаўнай граніцы з Польшчай.

Вялікай перамогай Савецкай Арміі было вызваленне 3-ім Беларускім фронтам сталіцы Літвы — Вільнюса.

У перыяд з 17 па 20 ліпеня войскі 1-га Беларускага фронту на шырокім участку — ад вярхоўя ракі Нарэв да горада Хелм — перасяклі дзяржаўную граніцу з Польшчай. 20 ліпеня на тэрыторыю Польшчы ўступілі таксама і войскі 2-га і 3-га Беларускіх франтоў. Адначасова ў паўднёва-ўсходнія раёны Польшчы ўступілі войскі 1-га Украінскага фронту. Так быў пакладзены пачатак вызваленню братняга польскага народа Узброенымі Сіламі Савецкага Саюза. Уступіла на сваю родную зямлю і

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НАСТАЎ, НАРЭШЦЕ, ДЗЕНЬ, КАЛІ ЎСЯ БЕЛАРУСЬ БЫЛА АЧЫШЧАНА АД ВОРАГАЎ. АД ПОЎНАГА ФІЗІЧНАГА ЗНІШЧЭННЯ БЕЛАРУСКІ НАРОД БЫЎ ВЫРАТАВАНЫ ГЕРАІЧНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ, ГЕРАІЧНЫМІ ПАРТЫЗАНСКІМІ ЗЛУЧЭННЯМІ. ТАК БЕЛАРУСКІ НАРОД МУЖНАСЦЮ І ГЕРАІЗМАМ У БАРАЦЬБЕ З НЯМЕЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ ПА ПРАВУ ЗАВАЯВАЎ СЛАВУ ЛЕГЕНДАРНАГА НАРОДА.

Г. К. ЖУКАЎ,
Маршал Савецкага Саюза.

★★★★★★★★★★

## СЛАВА ЛЕГЕНДАРНАГА НАРОДА

МУЖНЫ беларускі народ тры гады вёў жорсткую барацьбу з захопнікамі... Арганізатарам і натхніцелем барацьбы гераічнага беларускага народа была Камуністычная партыя Беларусі, якая налічвала ў сваіх радах перад вайной 75 тысяч чалавек. Большасць камуністаў з першых дзён вайны пайшла ў Чырвоную Армію, значная частка — у падполле і партызаны. У выніку вялікай палітычнай і арганізатарскай работы Кампартыі Беларусі на акупіраванай тэрыторыі ўзнікла шырокая сетка падпольных партыйных арганізацый. Тут дзейнічала 9 падпольных абкомаў, 174 райкомы і гаркомы партыі і каля 1300 пярвічных падпольных арганізацый. У саставе партызанскіх атрадаў і падпольных груп змагалася з ворагам больш як 98 тысяч камсамольцаў і камуністаў. Армія партызан, якая дзейнічала ў Беларусі, складала 374 тысячы чалавек.

Усяго за адну ноч на 20.6.44 г. было перабіта 40.775 рэек. На асноўнай артэрыі Брэст — Баранавічы — Мінск — Орша было перабіта ў адну ноч 11.240 рэек, на лініі Брэст — Лунінец — Старушкі — 3.095 рэек, на лініі Вілька—Дзвінск беларускія партызаны разам з літоўскімі і латвійскімі перабілі 2.375 рэек...

Партызанскія атрады і злучэнні няспынна нападалі на адступаючыя часці праціўніка, знішчалі і захоплівалі ў палон гітлераўскіх салдат і афіцэраў.

П. ПАНАМАРЭНКА,
былы начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

★ ★



*Плошча Перамогі сталіцы Беларусі.*

*Фота Д. ПРЭСА.*

